**ІКА́ЗНЕНСКАЯ МІКАЛА́ЕЎСКАЯ ЦАРКВА́**, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю ў в. Іказнь Браслаўскага р-на. Пабудавана ў 1905 з цэглы ў традыцыях Маскоўскай школы дойлідства 17 ст. Мае 3-часткавую аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю: асн. аб'ём, 5-гранная апсіда, бабінец-званіца. Двух'ярусны асн. аб'ём у плане блізкі да квадрата, завершаны цыбулепадобным купалам на 8-гранным светлавым барабане (вокны зашыты). Званіца над бабінцам 2-ярусная ў форме васьмерыка на чацверыку, завершана шатровым перакрыццем з макаўкай. Пластычны дэкор ствараюць аркатурныя паясы, сухарыкі, прафіляваныя карнізы, абрамленні аконных праёмаў, кілепадобныя какошнікі бакавых фасадаў і шатра, вуглавыя калонкі. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Царква дзейнічае.

*Ю.Ю.Захарына.*

***Іказненская Мікалаеўская царква.***



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ